Брестский районный исполнительный комитет
Историко-мемориальный музей «Усадьба Немцевичей»
Учреждение образования
«Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»

# ВЕЛИКАЯ ЕВРОПЕЙСКАЯ ВОЙНА

Сборник материалов
IV Международной научно-практической конференции

д. Скоки Брестского района, 11 декабря 2015 года

Брест
БрГУ имени А.С. Пушкина
2016

УДК 94(476)"1914/1918"(06)+355.48(476)"1914/1918"(06)
ББК 63.3(2)535-68я431
В 27

*Рецензенты:*
кандидат исторических наук, доцент
**А.В. Мощук**
кандидат исторических наук, доцент
**А.А. Савич**

*Под общей редакцией*
доктора исторических наук **А.Н. Вабищевича**

В 27 **Великая** европейская война : сб. материалов IV Междунар. науч.-практ. конф., Скоки Брест. р-на, 11 дек. 2015 г. / Брест. райисполком, ист.-мемориал. музей «Усадьба Немцевичей», Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина ; под общ. ред. А. Н. Вабищевича. – Брест : БрГУ, 2016. – 88 с. : фот.
ISBN 978-985-555-547-7.

В сборник включены доклады и сообщения, посвященные различным аспектам истории Первой мировой войны (1914–1918 гг.). Авторы статей представили результаты исследований по истории, архивоведению, источниковедению истории, музееведению, нумизматике, истории культуры, просвещения, краеведению.

Издание адресуется ученым, преподавателям, учителям, обучающимся, работникам учреждений культуры.

**УДК 94(476)"1914/1918"(06)+355.48(476)"1914/1918"(06)**
**ББК 63.3(2)535-68я431**

**ISBN 978-985-555-547-7**

© УО «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина», 2016

14. Русское чтение. – 1914. – № 185.

15. Русское чтение. – 1914. – № 186.

16. Санитарная служба русской армии в войне 1914–1917 гг. : сб. докл. / Центр. воен.-ист. арх. СССР и Гл. воен.-санитар. упр. Крас. Армии. – Куйбышев : Куйбышев. воен.-мед. акад. Крас. Армии, 1942. – 464 с.

17. Сборник приказов по Военному ведомству. – Петроград, 1917.

18. Трескунова, Б. Некоторые данные об организации госпитализации и эвакуации раненых во внутренние районы России в период 1914–1915 гг. / Б. Трескунова // Воен.-мед. журн. – 1939. – № 7. – С. 17–31.

19. Церковный вестник. – 1914. – № 41.

20. Церковный вестник. – 1914. – № 48.

21. XIV съезд российских хирургов. Москва, 16–19 дек. 1916 г. – М. : О-во рос. хирургов, 1927. – 448 с.

22. Юрий, М. Ф. Буржуазные общественные организации в период Первой мировой войны, 1914–1918 гг. (Всероссийский земский союз, Всероссийский союз городов, Земгор, Центральный военно-промышленный комитет) : дис. … д-ра ист. наук. – Черновцы, 1990.

УДК 94(476)“1914/1918”+930.25(476.1)(091)

**А.М. Вабішчэвіч**

Рэспубліка Беларусь, г. Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна

## ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ ЗАНАЛЬНАГА ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА Ў Г. МАЛАДЗЕЧНА АБ НАСТУПСТВАХ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна Мінскай вобласці з’яўляецца адной з адметных рэгіянальных архіўных устаноў Рэспублікі Беларусь. Створаны ў лютым 1940 г. Дзяржаўны архіў Вілейскай вобласці ў Вілейцы ў верасні 1944 г. быў перайменаваны ў Дзяржаўны архіў Маладзечанскай вобласці і перамясціўся ў Маладзечна, а ў студзені 1960 г. быў пераўтвораны ў філіял Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці ў г. Маладзечна. З 1996 г. архіў перайменаваны ў Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна.

Агульны пералік яго фондаў (без аналізу зместу іх вопісаў) быў выкладзены ў выдадзеных архіўных даведніках [2; 3; 15]. Пералік фондаў Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Маладзечна ў сукупнасці з іншымі айчыннымі архіўнымі ўстановамі змешчаны ў шэрагу тэматычных архіўных даведнікаў. Дакументальныя крыніцы з гэтага архіва публікаваліся ў зборніках дакументаў і матэрыялаў, асобных манаграфічных даследаваннях, перыядычным друку, выкарыстоўваліся ў гісторыка-дакументальных

хроніках “Памяць”. Інфармацыя пра фонды Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Маладзечна ўключана ў фондавы каталог дзяржаўных архіваў Рэспублікі Беларусь [19]. Аўтарам гэтага артыкула сумесна з польскімі спецыялістамі быў падрыхтаваны архіўны даведнік па матэрыялах 1918–1939 гг., што захоўваюцца ў гэтай установе, з аналізам фондаў і вопісаў [20, с. 21–124, 146–153, 157–261, 297–304], распрацавана пошукавая база звестак (на беларускай і польскай мовах) [18]. Таксама аўтарам артыкула быў праведзены аналіз наяўных фондаў Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Маладзечна па гісторыі заходнебеларускага рэгіёна ў 1918–1939 гг., вопісаў гэтых фондаў, ступені захаванасці змешчаных у іх спраў, дадзена праблемна-тэматычная характарыстыка архіўных матэрыялаў і вызначаны перспектывы іх выкарыстання [1].

Аднак яшчэ застаюцца слаба даследаванымі шматлікія крыніцы, у тым ліку звязаныя з ацэнкай страт, панесеных у гады Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Браслаўскага, Вілейскага, Віленска-Трокскага, Дзісенскага, Дунілавіцкага, Маладзечанскага, Ашмянскага, Пастаўскага, Свянцянскага паветаў Віленскага ваяводства і Валожынскага павета Навагрудскага ваяводства, і пасляваенным аднаўленнем гэтых мясцовасцей у 1920-я гг.

Фонд 436 “Браслаўскае павятовае староства” (1919–1939 гг.) утрымлівае матэрыялы аб устанаўленні шкоды, нанесенай Першай сусветнай і польска-савецкай войнамі, і мерах па аказанні дапамогі пацярпеламу насельніцтву, аб кампенсацыі ваенных страт, вяртанні страчанай падчас вайны маёмасці, рэпатрыяцыі насельніцтва з Савецкай Расіі пасля сканчэння Першай сусветнай вайны, аб колькасці людзей, загінуўшых падчас Першай сусветнай вайны, і інш.

Фонд 382 “Начальнік 1-га раёна Ашмянскага павета, мястэчка Жупраны” ўключае цыркуляры, загады, указанні, распараджэнні, інструкцыі Ашмянскага павятовага староства аб уліку ўрону, нанесенага гаспадаркам баявымі дзеяннямі падчас Першай сусветнай і польска-савецкай войн.

Ужо ў час дзейнасці Грамадзянскага ўпраўлення ўсходніх зямель у 1919–1920 гг. у яго структуры былі створаны асобныя камісіі па ўліку ваенных страт насельніцтва.

14 лістапада 1921 г. ашмянскі павятовы стараста даручыў каменданту паліцыі, начальнікам раёнаў, войтам гмін Ашмянскага павета, бурмістру г. Ашмяны давесці насельніцтву інфармацыю аб створанай у Вільні камісіі па рэгістрацыі ваенных страт на тэрыторыі Сярэдняй Літвы. “Да сферы дзеяння гэтай камісіі належыць найперш прыняцце дэкларацый аб кампенсацыі за рэквізаваную, забраную ці знішчаную маёмасць расійскімі, нямецкімі, бальшавіцкімі, польскімі і літоўскімі войскамі. Акрамя таго, камісія займалася справай рээвакуацыі маёмасці, вывезенай у Расію і Украіну” [4, арк. 1]. Пацярпелыя маглі складваць адпаведныя

дэкларацыі ў старостве ці ва ўправах начальнікаў раёнаў. Быў вызначаны тэрмін складвання такіх дэкларацый – да 1 снежня 1921 г. Да дэкларацый пацярпеламу неабходна было прыкладаць дакументы для пацвярджэння (квітанцыі аб рэквізіцыі, акты, полісы, багажныя квітанцыі і інш.). У выпадку адсутнасці пісьмовых доказаў пацярпелы павінен быў прывесці двух сведкаў, якіх апытвалі пад прысягай [4, арк. 4]. Як сведчыць тэкст прысягі для католікаў, сведкі павінны былі добрасумленна пацвярджаць чыстую праўду, нічога не ўтойваць, памятаючы пра тое, што “абавязаны разлічыцца перад законам і перад Богам на страшным судзе” [4, арк. 6]. Для дапамогі былі прызначаны практычныя ўказанні адносна збірання доказаў па пытаннях ваенных страт і асобная інструкцыя для пацярпелых. Маёмасць, якая была вывезена ў Расію і там знаходзілася, павінна была рэгістравацца дэлегатамі Галоўнага ліквідацыйнага ўпраўлення паводле асобнай інструкцыі [4, арк. 7–11адв.].

У фондзе 383 “Начальнік 3-га раёна Ашмянскага павета, мястэчка Гальшаны” (1920–1922 гг.) знаходзіцца перапіска начальніка 3-га раёна Ашмянскага павета з павятовым старостам, гмінным праўленнямі, органамі паліцыі аб ахове ваенных трафеяў і інш.

Фонд 350 “Камісія па рэгістрацыі ваенных стратаў у Ашмянскім павеце Віленскай акруговай камісіі па рэгістрацыі ваенных стратаў” (1919–1923 гг.) уключае цыркуляры, распараджэнні і аб’явы Грамадзянскага кіравання ўсходніх зямель, пратаколы пасяджэнняў павятовай камісіі, перапіску з Цэнтральнай камісіяй па рэгістрацыі ваенных страт II Польскай Рэспублікі па адміністрацыйна-гаспадарчых пытаннях, асабовым складзе, рээвакуацыі маёмасці грамадзян з Савецкай Расіі, інструкцыю аб правядзенні рэгістрацыі ваенных страт, справаздачы аб рэгістрацыі шкоды, нанесенай гаспадарцы і грамадзянам Ашмянскага павета баявымі дзеяннямі падчас Першай сусветнай і польска-савецкай войн, матэрыялы па ўліку і кампенсацыі ваенных страт гаспадарцы павета (кніга рэгістрацыі шкоды і інш.), заявы грамадзян аб кампенсацыі шкоды і атрыманні пазыкі за ўрон, нанесены іх гаспадаркам баявымі дзеяннямі, прэйскуранты цэн на жывёлу, прадукты харчавання і інш. Таксама там ёсць спісы грамадзян, якія хадайнічалі аб атрыманні пазыкі за ўрон, нанесены падчас Першай сусветнай і польска-савецкай войнаў, гаспадарак, знішчаных баявымі дзеяннямі.

Страты былі нанесены і касцёлу Святога Іаана Хрысціцеля ў Гальшанах Ашмянскага павета. 13 студзеня 1922 г. ксёндз Вацлаў Родзл (у канцоўцы прозвішча можа быць недакладнасць, бо па-польску напісана невыразна), пробашч Гальшанскай парафіі, напісаў заяву ў камісію па ўліку і ліквідацыі ваенных страт Ашмянскага павета, у якой прасіў пачаць старанні адносна вяртання з Расіі вывезеных касцёльных званоў

ці адпаведнай кампенсацыі. “22 жніўня 1915 года паводле распараджэння галоўнага начальніка ваеннай акругі былі забраны з парафіяльнага касцёла ў Гальшанах 3 званы агульнай вагой 1 815 фун.[таў] і вывезены ў Расію – і парафія засталася зусім без званоў” [5, арк. 1]. У спісе страт было адзначана наступнае: “Вывезены ў Расію 3 касцёльныя званы старажытнай работы, адлітыя з медзі і серабра агульнай вагой 1 815 фунтаў па 5 васьмушак фунт = 9 075 васьмушак золатам” [5, арк. 5]. Акрамя спісу страт, да дэкларацыі пацярпелага аб ваенных стратах была дададзена копія пратакола, складзеная расійскімі ўладамі (ніжэй прыведзены дакумент з захаваннем асаблівасцей мовы арыгінала).

Копия.

Протоколъ.

1915 года августа 22 дня я, Настоятель Гольшанского Римско-Католическаго прихода, по требованию местного полицейского урядника 5 стана Ошмянского уезда Виленской губ., основанного на копии телеграммы г. Главного Начальника Округа отъ 21-го августа за № 108 и местного пристава настольного 4897 выдалъ три колокола, принадлежащие Гольшанскому Р.К. Костелу.

I. Первый колокол весом 25 пудов и 15 фунтовъ. Имеет сверху следующие надписи: “Jezus Maria Jozeph. Ad honorem Sancti Joannis Baptistae A.D. 1725. Haec campana olim ab. Hl. fundatore huius Ecclesiae Paulo Sapieha Duce holszanensi erecta dein edaci rerum tempore fracta A.D. M.D. CCCLXXXIII. Prorum elecmosinis restaurata est”.

II. Второй колокол 15 пудов. Имеет сверху также надписи: “Me fecitl. S. Waehner Wilna A.D. 1806. Parafję tendzwonprzelewała”.

III. Третий колокол весом 5 пудов. Имеет сверху надписи: “Adhonorem S. Francisci Crestaurata A.D. 1883”.

Выдал настоятель кс. Войцеховский

Принял полицейский урядник 5 стана

Ошмянского уезда [подпіс неразборлівы]

Присутствовал Гольшанский

волостной старшина Цимоховичъ

[Валасная пячатка]

З арыгіналам зверана [подпіс]

[пячаткі начальніка 3-га раёна Ашмянскага павета] [5, арк. 4].

16 мая 1922 г. у згаданую ўжо камісію па ўліку і ліквідацыі ваенных страт Ашмянскага павета была напісана і заява ад камітэта праваслаўнай царквы мястэчка Смаргонь. Да яе былі далучаны дзве дэкларацыі пацярпелых і спіс страт, “нанесеных нямецкімі войскамі ў верасні 1915 года на суму 2 345 рублёў золатам” [6, арк. 1]. Сярод маёмасці царкоўнага камітэта фальварка Нароты Смаргонскай гміны, страчанай

ад непасрэдных баявых дзеянняў, былі пазначаны ўзведзеныя ў 1889 г. наступныя пабудовы: "1. Драўляны сасновы дом, на каменным падмурку, пакрыты гонтамі, даўжынёй 12 аршынаў (1 аршын = 71,12 см. – А. В.), шырынёй 9 аршынаў, вышынёй 5 аршынаў. Падзелены на 4 пакоі. 5 вокнаў вышынёй 2 аршыны, шырынёй 1 ½ аршына, 3 філёнчатыя дзверы, 2 печы. Падлога з сасновых дошак 1 ½ цалі (1 цаля = 2,54 см. – А. В.), пафарбаваных. Сцены атынкованы і абклеены шпалерамі… 2. Стадола з сасновага дрэва, на каменным падмурку, пакрытая гонтамі, даўжынёй 18 аршынаў, шырынёй 9 аршынаў, вышынёй 4 аршыны… 3. Свіран з сасновага дрэва, на каменным падмурку, пакрыты гонтамі, даўжынёй 9 аршынаў, шырынёй 8 аршынаў, вышынёй 4 аршыны… 4. Хлеў з сасновага дрэва, на каменным падмурку, пакрыты гонтамі, даўжынёй 20 аршынаў, шырынёй 10 аршынаў, вышынёй 4 аршыны" [6, арк. 4].

Акрамя таго, у яшчэ адным пададзеным спісе страт, які панёс Смаргонскі праваслаўны царкоўны камітэт ад баявых дзеянняў нямецкіх войскаў у верасні 1915 г., прыведзены былі аб'екты маёмасці на агульную суму 14 160 рублёў. Сярод іх былі драўляныя жылы дом і хлеў, пабудаваныя ў 1889 г., а таксама шмат драўляных пабудоў, узведзеных у 1900 г.: жылы дом псаломшчыка, школьны будынак ("з сасновага дрэва, на каменным падмурку, пакрыты гонтамі, даўжынёй 30 аршынаў, шырынёй 16 аршынаў, вышынёй 6 аршынаў, падзелены на 6 пакояў… У школе знішчаны рэчы, лаўкі, сталы, шафы і карты"), дом настаўніка, а таксама іншыя жылыя і гаспадарчыя пабудовы [7, арк. 2–2адв., 5–5адв.]. У асобнай заяве страты іншых будынкаў, узведзеных у 1895 г., былі ацэнены на суму 6 660 рублёў золатам [8, арк. 1–2адв.].

У адным са спісаў страт Смаргонскага праваслаўнага царкоўнага камітэта з 16 630 рублёў 5 880 рублёў складаў урон, нанесены будынку паўразбуранай царквы ("сцены засталіся").

"1. Знішчаныя часткова сцены мураванай царквы (менавіта 30 000 цаглін, 300 пудоў вапны і 10 бочак цэменту) з работай – 2 000 [рублёў].

2. Дах з жалеза, пад ім 14 драўляных слупоў, на кроквы – 22 штукі, для звязкі крокваў – 11 слупоў, слупы пад вежы – 16 штук, для падпоркі зверху і знізу – 20 штук і на латы – 14 штук – 1 100.

3. Выраб усяго даху з вежамі 2 030 кв. аршынаў жалеза. З работай каштаваў – 1 100.

4. Пад падлогай былі пакладзены 24 доўгія бэлькі па 20 аршынаў, таўшчынёй па 8 цаляў – 350.

5. Падлога з сасновых дошак… – 500.

6. 22 вокны вышынёй 2 аршыны, шырынёй 1 ½ аршыны, з жалезнымі кратамі – 250.

7. 6 філёнчатых пакрашаных дзвярэй – 130…" [9, арк. 1–2].

Вялікімі былі страты рымска-каталіцкай парафіі ў Смаргоні. У заяве, пададзенай 27 снежня 1921 г. у камісію па ўліку і ліквідацыі ваенных страт Ашмянскага павета, была просьба аб кампенсацыі. У дакуменце адлюстраваны разбуральныя вынікі баявых дзеянняў для мясцовага насельніцтва. “У час расійска-нямецкай вайны немцамі была разбурана святыня, якую мы пабудавалі на свае апошнія сродкі перад самай вайной, і амаль што цалкам разбіты другі, стары касцёл, які быў перададзены ў 1866 г. пад царкву. Наша парафія знаходзіцца ў самай прыфрантавой паласе, і яе таксама знішчылі, як і наш касцёл. Самі не маем дамоў, а жывём мы ў акопах і ямах, так што не можам узвесці самі не толькі новы храм, але нават адрамантаваць разбітыя муры старога касцёла, які быў забраны пад царкву” [10, арк. 1].

Поўнасцю разбураны ў гады Першай сусветнай вайны мураваны касцёл у Смаргоні быў культавай пабудовай неараманскага стылю, уяўляў сабой 3-нефавую 2-вежавую базіліку з трансептам. Маляўнічасць гэтаму храму надавалі 2 вежы (4-ярусныя 4-гранныя шатровыя) з 3-вугольным франтонам паміж імі. На верхніх ярусах вежаў над вялікімі вокнамі-біфорыумамі былі размешчаны гадзіннікі [16, с. 197–198]. “Мураваны касцёл, пабудаваны ў раманскім стылі ў форме крыжа, на каменным фундаменце і каменным цокале (вышынёй 1 ½ аршына), даўжынёй 60 аршынаў, шырынёй 30 аршынаў, шырынёй у перакрыжаванні – 40 аршынаў; выкладзены ўнутры і знадворку белай шліфаванай цэглай, пакрыты цынкавай бляхай. Меў 14 вокнаў варшаўскай фабрычнай работы; 2 вежы вышынёй па 60 аршынаў (гэта складае 42,67 м, што разыходзіцца з прыведзенымі звесткамі А. Кулагіна (вышыня вежы – 30 м) [16, с. 198]); на касцёле 3 жалезныя крыжы вышынёй па 5 аршынаў. Завершаны ў 1914 годзе – 300 000 руб.” [10, арк. 2]. Цэглу гэтага разбуранага храма выкарысталі пры ўзвядзенні ў 1937–1939 гг. за ахвяраванні мясцовых вернікаў 3-павярховага народнага дома (зараз – хрысціянскі цэнтр).

Пашкоджаны будынак касцёла, які з’яўляўся ў 1866–1921 гг. Міхайлаўскай царквой, быў “мураваны ў візантыйскім стылі, даўжынёй 36 аршынаў, шырынёй 27 аршынаў, пакрыты бляхай”. “Завершаны ў 1856 г. У час вайны немцамі быў разбураны фасад касцёла, поўнасцю збіты скляпенні, выбіты вокны, ва ўсім касцёле сцены былі пабіты снарадамі. Кошт касцёла перад вайной – 150 000 руб.” [10, арк. 2]. Акрамя ўрону будынкам касцёлаў, у пераліку 54 пазіцый страт Смаргонскай парафіі былі пазначаны наступныя найбольш значныя каштоўнасці: пабудаваная ў 1908 г. драўляная плябанія (даўжынёй 27 аршынаў, шырынёй 18 аршынаў, вышынёй 5 ½ аршына, з 10 вокнамі, пакрытая гонтамі) – 3 250 руб.; фісгармонія – 500 руб.; 24 вялікія нікелевыя ліхтары – 480 руб.; вялікі нікелевы працэсіяльны крыж – 150 руб.;

4 перанасныя алтарыкі – 600 руб.; жалезная балюстрада каля 3 алтароў варшаўскай фабрычнай работы – 400 руб.; 3 вялікія абразы, намаляваныя на палатне, у рамках – 600 руб.; Галгофа, намаляваная на палатне, у рамках – 14 штук – 700 руб.; балдахін для працэсіі на чатырох шастах, абіты шоўкам з залатой манаграмай, – 500 руб.; 2 вялікія вісячыя бронзавыя жырандолі – 1 000 руб.; арнат шаўковы, вышыты золатам і серабром, такое ж і пакрывала – 600 руб.; 10 шаўковых арнатаў розных колераў з залатымі манаграмамі – 1 500 руб.; 7 шаўковых пакрывал з залатымі манаграмамі – 1 050 руб. і інш. Увесь памер страт быў ацэнены ў 464 894 руб. [10, арк. 2–3адв.]. Касцёл Святога Міхаіла Архангела ў Смаргоні быў адноўлены ў 1926 г. Роспісам касцёла займаўся заходнебеларускі мастак П. Сергіевіч.

Свае хадайніцтвы (2 дэкларацыі) аб кампенсацыі ўрону, панесенага ад абстрэлаў нямецкіх войскаў у верасні 1915 г., склаў і гарадскі магістрат Смаргоні. У спісе страт на агульную суму 76 167 руб. золатам фігуравалі і мураваныя будынкі, узведзеныя ў 1899 г.: 2-павярховы гмах ("пакрыты гонтамі, на каменным фундаменце, даўжынёй 35 аршынаў, шырынёй 20 аршынаў, вышынёй 12 аршынаў, падзелены на 8 пакояў"), склеп пад будынкам. Згарэла драўляная стадола, пабудаваная ў 1900 г., а таксама начынне знішчаных будынкаў: пісьмовы дубовы стол, 3 дубовыя кніжныя шафы і 2 сталы, 24 венскія крэслы, сейф ("вогнетрывалая каса") [11, арк. 1–2].

Культавыя помнікі пацярпелі як ад баявых дзеянняў, так і ад эвакуацыі каштоўнасцей царскімі войскамі на ўсход, углыб Расійскай імперыі, ад ваенных рэквізіцый нямецкіх акупацыйных войскаў. Настаяцель касцёла Святых апосталаў Пятра і Паўла ў Жупранах Ашмянскага павета, рэтрагатычнага стылю, пабудаванага ў 1854–1875 гг., ксёндз Рышард Кнобельсдорф дабіўся складвання вопісу і ацэнкі ўсёй касцёльнай маёмасці.

Акт

1915 года августа 20 дня, я пристав 1 стана Ошмянского уезда Виленской губернии

вследствии личного ходатайства настоятеля Жупранского костёла кс. Рышарда Вильгельмова Кнобельсдорфа о составлении описи и оценки принадлежащего ему движимого, недвижимого имущества и посевов, находящихся в Жупранах, руководствуясь циркулярными предписаниями господина Виленского Губернатора по уездам от 17 июля № 23963 прибыл сего числа совместно с оценщиками и понятыми общества в усадебное место просителя кс. Р.В. Кнобельсдорфа, где в присутствии самого настоятеля и приглашённых ниже подписавшихся добросовестных оценщиков и свидетелей произвёл опись всего движимого, недвижимого имущества, посевов и лесного пространства. Как видно из нижеследующей

описи, оценено на сумму 83 070 рублей. Предполагаемый урожай посевов выражается в 630 пудах зерна, 425 пудах соломы, 200 пудах сена, 150 п[удах] клевера и 1 550 пудах корнеплодов…” [12, арк. 7].

Далей у спіс была старанна ўнесена маёмасць касцёла (ацэнена на суму 78 485 руб.), а таксама ўласная нерухомая і рухомая маёмасць настаяцеля храма. Сярод найбольш значных касцёльных каштоўнасцей адзначаны наступныя: каменны касцёл – 40 000 руб., каменны дом – 7 000 руб., драўляны дом для прыслугі – 1 000 руб., гумно – 1 500 руб., арган – 1 500, звон на вежы (12 пудоў) – 400, 2 меншыя званы – 300, каляровы вітраж – 400, 3 жырандолі – 300, 3 сярэбраныя чашы – 250, 12 падсвечнікаў “Фраусе” – 240, ікона Маці Божай у сярэбранай рызе – 300, ікона Св. Антонія ў пазалочанай рызе – 200 [12, арк. 7–8]. Аднак яшчэ летам 1915 г. расійскімі войскамі былі вывезены на ўсход згаданыя званы Жупранскага касцёла (вялікі і два меншыя) [12, арк. 5].

Ваенныя страты касцёла ў Жупранах складалі 3 630 руб. Сярод іх ксёндз Р. Кнобельсдорф у дэкларацыі пазначыў рэквізаваныя нямецкімі войскамі 12 вялікіх алавяных труб з аргана, 12 алавяных ліхтароў, некаторыя іншыя металічныя прадметы [12, арк. 1–2]. Сам будынак касцёла атрымаў пашкоджанні ад артылерыйскага абстрэлу (“у трох месцах”), быў разбіты каляровы вітраж, выбіты зверху ўсе шыбы [12, арк. 4]. На “рахунак” нямецкіх акупантаў залічаны і ўрон, нанесены плябаніі ў Жупранах: “забралі 3 двайныя вокны, …страха… на даху, 4 печы зруйнаваны, знішчана падлога, разбіты 14 шыбаў..; гумно зруйнавана.., свіран перароблены на стайню.., вазоўня зруйнавана.., лазня поўнасцю разабрана і спалена.., лядоўня спалена на дровы.., новая агароджа ўся спалена.., ½ дзесяціны зямлі змарнавана акопамі і чыгуначным палатном…” [12, арк. 3].

Са сваёй дэкларацыяй аб кампенсацыі ваеннага ўрону выступіла яўрэйская гміна мястэчка Солы. Свае страты ад нямецкіх войскаў у 1915 г. яна ацэньвала сумай 1 199,5 руб. – гэта будынак склада пажарнай аховы і адпаведны інструмент для тушэння пажару (помпы, бочкі, крукі, сякеры, лапаты і інш.) [13, арк. 2].

У фондзе 385 ёсць перапіска начальніка 6-га раёна Ашмянскага павета мястэчка Гальшаны з павятовым старостам, органамі паліцыі, судовымі органамі 1919–1921 гг. аб рэгістрацыі ўрону ад баявых дзеянняў Першай сусветнай і польска-савецкай войн, вяртанні маёмасці і жывёлы, заяў грамадзян аб вяртанні маёмасці і жывёлы, страчаных падчас вайны.

Дакументы Дзісенскага павятовага староства (фонд 437) утрымліваюць звесткі аб вяртанні архіваў і царкоўнай маёмасці, вывезеных у Расію пасля падзелаў Рэчы Паспалітай (спр. 1337), спісы эмігрантаў, рэпатрыянтаў, сем’яў і магіл воінаў, загінуўшых падчас Першай сусветнай і польска-савецкай войнаў і інш.

У час праведзенай на ўсход эвакуацыі летам 1915 г. углыб Расіі былі вывезены шматлікія царкоўныя каштоўнасці з беларускіх зямель. Напрыклад, былі зняты і вывезены званы Свята-Мікалаеўскай праваслаўнай царквы в. Чарасы Дзісенскага (з 1926 г. – Браслаўскага) павета. Царква была пабудавана (трэба меркаваць, што перабудавана) з цэглы ў рэтраспектыўна-рускім стылі ў 1885–1886 гг. [8, с. 203]. Да асобнай заявы ад 5 (18) мая 1922 г. быў прыкладзены спіс вывезеных званоў.

1. Звон. Надпіс: "Gloria in exceltis Deo
dlia Bractwa Cerkwi Czeresskiej
fecit in Riga Ernst Beggro 1786 anno".

30 пудоў. У 1915 г. забрала паліцыя. Знаходзіцца на артылерыйскім складзе ў Маскве.

2. Звон. Надпіс "Me fecit August Hessel. Riga Anno 1770". 20 пудоў.

3. Звон – 2 пуды 2 ¾ фунта.

4. Звон – 1 пуд 6 фунтаў.

5. Звон – 20 ¼ фунта.

6. Звон – 19 ½ фунта.

7. Звон – 8 фунтаў.

8. Звон. Надпіс "Me fecit August Hessel in Riga. Anno 1793". 17 пудоў.

9. Звон. Надпіс – той жа. 2 пуды.

10. Звон – 30 фунтаў" [14, арк. 6–9].

У той час усе званы Чараскай царквы знаходзіліся на артылерыйскім складзе ў Маскве.

Дамагаўся вяртання эвакуіраванай у Расію царкоўнай маёмасці і айцец Міхаіл Іванкевіч, настаяцель Свята-Успенскай царквы в. Кавалі Глыбоцкай гміны Дзісенскага павета [14, арк. 21]. Гэтая царква, якая была пабудавана з дрэва яшчэ ў 1748 г. у стылі барока, была рэканструявана ў канцы XIX ст. [17, с. 93].

У фондзе Мядзельскай гміннай управы Пастаўскага павета (фонд 55) таксама захоўваюцца матэрыялы аб ацэнцы ўрону, нанесенага мясцовым гаспадаркам падчас Першай сусветнай вайны.

Фонд 473 "Дзяржаўнае бюро аднаўлення Браслаўскага павета" (1921–1924 гг.) утрымлівае цыркуляры, пастановы і інструкцыі Савета Міністраў II Польскай Рэспублікі, Міністэрства грамадскіх работ, пратаколы пасяджэнняў бюро аднаўлення і камісіі па аказанні дапамогі насельніцтву Браслаўскага павета, перапіску з акруговай дырэкцыяй аднаўлення і гміннымі праўленнямі, журнал уліку маёмасці насельніцтва, знішчанай падчас Першай сусветнай вайны, касавую кнігу, матэрыялы аб аказанні дапамогі насельніцтву і кампенсацыі ўрону, нанесенага гаспадаркам і грамадзянам баявымі дзеяннямі (заявы грамадзян, планы будаўніцтва дамоў і збудаванняў, акты на атрыманне крэдыту для

аднаўлення пабудоў і інш.). Таксама там ёсць спісы грамадзян, якія пацярпелі падчас Першай сусветнай вайны, праектныя матэрыялы (планы, чарцяжы дамоў).

Матэрыялы па вызначэнні шкоды, нанесенай маёмасці насельніцтва Браслаўскага павета падчас баявых дзеянняў Першай сусветнай і польска-савецкай войн, знаходзяцца ў фондзе Камісіі па рэгістрацыі ваенных стратаў у Браслаўскім павеце (фонд 475).

Аналагічныя матэрыялы па вызначэнні стратаў, нанесеных маёмасці насельніцтва Дзісенскага павета, змешчаны ў фондзе 462 "Камісія па рэгістрацыі ваенных стратаў у Дзісенскім павеце" (1920–1921 гг.), а па Дунілавіцкім павеце – у фондзе 461 "Камісія па рэгістрацыі ваенных стратаў у Дунілавіцкім павеце" (1920–1921 гг.).

Справы аб аказанні дапамогі будаўнічымі матэрыяламі для насельніцтва Дзісенскага павета, якое пацярпела падчас Першай сусветнай вайны, перапіска з Дзісенскім павятовым староствам, а таксама спісы грамадзян, якія пацярпелі падчас Першай сусветнай вайны, праектныя матэрыялы (планы, чарцяжы дамоў) захоўваюцца ў фондзе 474 "Дзяржаўнае бюро аднаўлення Дзісенскага павета" (1921–1923 гг.).

Дакументы мужчынскай настаўніцкай дзяржаўнай семінарыі ў мястэчку Баруны (1921–1932 гг.) (фонд 204) таксама ўтрымліваюць асобныя дакументы, звязаныя з негатыўнымі вынікамі Першай сусветнай вайны. У прыватнасці, ёсць інфармацыя аб неабходнасці перадачы СССР архіўных матэрыялаў 1772–1918 гг. (спр. 95), справаздачы і звесткі аб уроне, нанесеным семінарыі нямецкімі войскамі падчас Першай сусветнай вайны і інш.

У цэлым агляд фондаў дакументаў, што захоўваюцца ў Занальным дзяржаўным архіве ў г. Маладзечна, сведчыць аб тым, што яшчэ цэлыя масівы матэрыялаў камісій па ацэнцы страт, бюро адбудовы, павятовых органаў улады, органаў гміннага самакіравання пакуль не ўведзены ў навуковы ўжытак. Яны з'яўляюцца вельмі каштоўнымі крыніцамі па гісторыі паўсядзённасці заходнебеларускага насельніцтва пасля Першай сусветнай вайны і заслугоўваюць пільнай увагі даследчыкаў.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Вабішчэвіч, А. М. Дакументы Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Маладзечна як крыніцы па гісторыі заходнебеларускага рэгіёну ў 1918–1939 гг. / А. М. Вабішчэвіч // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2015. – № 2. – С. 32–39.

2. Государственные архивы Брестской, Гродненской областей, филиал Государственного архива Минской области в Молодечно : справочник (по док. материалам 1919–1939 гг.) / Арх. упр. при Совете Министров БССР, Арх. Отд. исполкомов Брест., Гродн., Мин. обл. Советов депутатов трудящихся ; сост.: Т. Д. Либеровская (отв. сост.) [и др.]. – Минск : Полымя, 1969. – 80 с.

3. Государственный архив Минской области и его филиал в городе Молодечно : путеводитель (1917–1941 гг.) / Арх. упр. при Совете Министров БССР, Арх. отд. исполкома Мин. обл. Совета депутатов трудящихся ; редкол.: Т. А. Воробьева [и др.] ; сост.: Г. А. Гречкин [и др.]. – Минск : Полымя, 1967. – 188 с.

4. Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна (ЗДАМ). – Ф. 382. Воп. 1. Спр. 35.

5. ЗДАМ. – Ф. 350. Воп. 1. Спр. 6389.

6. ЗДАМ. – Ф. 350. Воп. 1. Спр. 6390.

7. ЗДАМ. – Ф. 350. Воп. 1. Спр. 6391.

8. ЗДАМ. – Ф. 350. Воп. 1. Спр. 6392.

9. ЗДАМ. – Ф. 350. Воп. 1. Спр. 6393.

10. ЗДАМ. – Ф. 350. Воп. 1. Спр. 6394.

11. ЗДАМ. – Ф. 350. Воп. 1. Спр. 6395.

12. ЗДАМ. – Ф. 350. Воп. 1. Спр. 7645.

13. ЗДАМ. – Ф. 350. Воп. 1. Спр. 7643.

14. ЗДАМ. – Ф. 437. Воп. 1. Спр. 1337.

15. Зональный государственный архив в г. Молодечно : путеводитель 1919–1941, 1944–2007 / Департамент по арх. и делопроизводству М-ва юстиции Респ. Беларусь ; сост.: М. П. Кириленко [и др.]. – Молодечно : Новопринт, 2014. – 339 с.

16. Кулагін, А. М. Каталіцкія храмы на Беларусі : энцыкл. давед. / А. М. Кулагін. – Мінск : БелЭн, 2000. – 216 с.

17. Кулагін, А. М. Праваслаўныя храмы на Беларусі : энцыкл. давед. / А. М. Кулагін. – Мінск : БелЭн, 2001. – 328 с.

18. Сумесны польска-беларускі праект "Польшча-Беларусь: агульная гістарычная спадчына" [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://archiwa.gov.pl/wspolne-dziedzictwo/.

19. Фондовый каталог государственных архивов Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://fk.archives.gov.by/catalogue/. – Дата доступа: 12.05.2015.

20. Polska-Białoruś. Wspólne dziedzictwo historyczne : przewodnik po materiałach archiwalnych 1918–1939. T. 1. Archiwum Państwowe Obwodu Brzeskiego, Archiwum Państwowe Obwodu Grodzieńskiego / oprac. i red. nauk.: E. Rosowska [et al.]. – Warszawa : AMALKER, 2013. – 361 s.

УДК 94(476)"1914/1918"

**А.А. Савіч**
Рэспубліка Беларусь, г. Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна

## НАСТАЎНІЦТВА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ І ЎМАЦАВАННЕ ПОЛЬСКАГА ЎПЛЫВУ Ў СФЕРЫ АДУКАЦЫІ

У пачатку XX ст. асветніцтва на беларускіх землях стала неад'емнай часткай грамадска-палітычнага жыцця і адным з рычагоў уздзеяння расійскай улады на беларускае грамадства, праз яе насельніцтва выхоўвалася ў прарасійскім духу ў адпаведнасці з ідэямі "самадзяржаўя,